## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Kieniewicz, S. Historyk a swiadomosć narodowa. Warszawa: Czytelnik, 1982.
2. Zakrzewski, S. Historiografia polska wobec wskrzeszenia panstwa. Lwow: Druk. zakładu narodowego im. Ossolińskiech, 1924.
3. Bochieński, A. Rozmyślania o polityce polskiej. Warszawa: Krajowa Agencja Wydawnicza, 1987.
4. Bocheński, A. Historia i polityka. Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy, 1989.
5. Balzer, O. Tradycja dziejowa unii polsko-litewskiej. Warszawa: Nakładem księgarni Gubrunowicza i syna, 1919.
6. Łukasiewicz, J. Polska jest mocarstwem. Warszawa: Narład Gebethnera i Wolffa, 1938.
7. Dmowski, R. Polityka Polska i odbudowanie Panstwa. Wydanie drugie. Warszawa: Nakładem księgarni Perzyński, Niklewiecz i s-ka, 1926.
8. Studnicki, W. Z przeeżyc i walk. Warszawa: Drukarnia Wł. Łazarskiego, 1928.
9. Сінкевіч, Е.Г. Місце краковської історичної школы в польскій історіографіі // Український історичний журнал. 2008. № 1. С. 194–201.
10. Kutrzeba, S. Kongres, traktat i Polska. Warszawa:, 1919.
11. Olęndzki, K. Kresy wschodnie a Polska. Warszawa: Druk. Z. Swięntóńskiego, 1919.
12. Studnicki, W. Połnoncno-wshodnie ziemie dawnej Rzeczypospolitej Polski. Warszawa: Druk Synòw St. Niemiry, 1919.
13. Kozicki, S. Sprawa granic Polski na konferencji pokojowej w Paryżu. Warszawa: Przyński, Niklewiiecz i Spòlka, 1921.

**УДК [94(476) + 327(438:47+57)(091)]”1920/1921”**

# ДА ПЫТАННЯ АБ УДЗЕЛЕ БЕЛАРУСКІХ ПРАДСТАЎНІКОЎ У ПРАЦЫ РЫЖСКАЙ МІРНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ (ВЕРАСЕНЬ 1920 г. – САКАВІК 1921 г.)

***В.М. Бароўская***

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь,* borovskaya-olga@mail.ru

Падчас мірнай канферэнцыі былі прадстаўлены розныя варыянты вырашэння будучыні тэрыторыі Беларусі, але выбар на карысць той або іншай альтэрнатывы, на жаль, ажыццяўляўся без удзелу беларускага боку, беларускія прадстаўнікі выступалі ў якасці назіральнікаў у складзе польскай ці савецкай дэлегацый. Прысутнасць беларускіх прадстаўнікоў падчас прац мірнай канферэнцыі не паўплывала на рашэнні, прымаемыя членамі і

старшынямі польскай і савецкай дэлегацый. Магчымасць выкарыстання мандата Ваенна-рэвалюцыйнага камітэту БССР ад 16 верасня 1920 г. ставілася ў прамую залежнасць ад ваенна-аператыўнага становішча, без пагаршэння якога савецкае кіраўніцтва разглядала ўдзел прадстаўнікоў з тэрыторыі Беларусі непажаданым фактам.

***Ключавыя словы:*** *мандат; мірная канферэнцыя; ваенна-рэвалюцыйны камітэт; Рыжскі мір; Беларусь.*

## К ВОПРОСУ ОБ УЧАСТИИ БЕЛОРУССКИХ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ В РАБОТЕ РИЖСКОЙ МИРНОЙ КОНФЕРЕНЦИИ (СЕНТЯБРЬ 1920 г. – МАРТ 1921 г.)

***О.Н.Боровская***

*Институт истории Национальной академии наук Беларуси, ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь, borovskaya-olga@mail.ru*

Во время мирной конференции были представлены различные варианты решения будущего территории Беларуси, но выбор в пользу той или иной альтернативы, к сожалению, осуществлялся без участия белорусской стороны, белорусские представители выступали в качестве наблюдателей в составе польской или советской делегаций. Присутствие белорусских представителей во время работы мирной конференции не повлияло на решение членов и председателей советской и польской делегаций. Возможность использования мандата Военно-революционного комитета БССР от 16 сентября 1920 г. ставилось в прямую зависимость от военно-оперативного положения, без ухудшения которого советское руководство рассматривало участие представителей с территории Беларуси как нежелательный факт.

***Ключевые слова:*** *мандат; мирная конференция; военно-революционный комитет; Рижский мир; Беларусь.*

## THE QUESTION OF THE PARTICIPATION OF BELARUSIAN REPRESENTATIVES IN THE WORK OF THE RIGA PEACE CONFERENCE (SEPTEMBER 1920 – MARCH 1921)

***O. Borovskaya***

*The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Academichnaya str., 1, 220072, Minsk, Belarus, borovskaya-olga@mail.ru*

During the peace conference, various options for solving the future of the territory of Belarus were presented, but the choice in favor of one or another

alternative, unfortunately, was made without the participation of the interested party, the Belarusian representatives acted as observers in the Polish or Soviet delegations. The presence of Belarusian representatives during the work of the peace conference did not affect the decisions of the members and chairmen of the Soviet and Polish delegations. The possibility of using the mandate of the Military Revolutionary Committee of the BSSR of September 16, 1920, was directly dependent on the military-operational situation, without deterioration of which the Soviet leadership considered the participation of representatives from the territory of Belarus as an undesirable fact.

***Keywords:*** *mandate; peace conference; the Committee military revolutionary; Treaty of Riga; Belarus.*

Заключным звяном польска-савецкіх перагавораў 1918–1921 гг. стала мірная канферэнцыя ў Рызе. Першы этап рыжскіх польска-савецкіх перагавораў стаў лёсавызначальным для беларускіх зямель. Падчас мірнай канферэнцыі былі прадстаўлены розныя варыянты вырашэння будучыні тэрыторыі Беларусі, але выбар на карысць той або іншай альтэрнатывы, на жаль, ажыццяўляўся без удзелу зацікаўленага боку, беларускія прадстаўнікі выступалі ў якасці назіральнікаў у складзе польскай ці савецкай дэлегацый. Беларускае пытанне, у адрозненне ад іншых спрэчных момантаў рыжскіх польска-савецкіх перагавораў, не было дакладна вызначана напярэдадні кіраўніцтвам абодвух бакоў, прапанаваныя старшыням дэлегацый інструкцыі проста абыходзілі яго ўвагай. Па трапнай заўвазе А. Р. Чарвякова ў яго лісце да Цэнтральнага Бюро КП(б)Б, кіраўнікі дэлегацыі фактычна мелі *carte blanche* ў вырашэнні будучыні тэрыторыі Беларусі, мелі магчымасць паступіцца гэтымі землямі дзеля атрымання той або іншай саступкі пры спрэчных момантах [5, с. 197–203]. Пастаянныя змены ў ваенна-аператыўным становішчы на фронце (прасоўванне польскіх войскаў углыб беларускіх зямель, намаганні Ю. Пілсудскага па рэалізацыі федэралістычнай праграмы шляхам супрацоўніцтва з дзеячамі Найвышэйшай Рады БНР, актывізацыя ваенных дзеянняў П. М. Урангелем) прымушалі кіраўніцтва Савецкай Расіі мець у запасе некалькі шляхоў магчымага вырашэння беларускага пытання. Тым больш неабходна было каардынаваць свае дзеянні з польскім бокам па беларускім пытанні, улічваць і прымаць контрмеры для супрацьдзеяння акцыям дзеячаў БНР. Гэтым тлумачыцца тая непаслядоўнасць у дзеяннях Народнага камісара замежных спраў РСФСР Г. В. Чычэрына.

Першапачаткова кіраўніцтва РСФСР лічыла падключэнне беларусаў да мірных перагавораў немэтазгодным, але актывізацыя з боку асобных дзеячоў БНР з мэтай атрымаць дазвол на ўдзел у польска-савецкіх перагаворах прымусіла савецкае кіраўніцтва прымаць адпаведныя меры. 7 верасня 1920 г. Радай Народных Міністраў БНР былі накіраваны ноты пратэсту на адрас урадаў Польшчы і РСФСР з патрабаваннямі дапусціць да ўдзелу дэлегацыю на чале з В. Ластоўскім на мірную канферэнцыю ў якасці законнага прадстаўніка беларускага народа. У ноце выказвалася абвінавачванне Польшчы і РСФСР ў незаконнасці іх патрабаванняў на беларускія землі. Што датычыцца прэтэнзій Савецкай Беларусі, то яе кіраўніцтва ў ноце характарызавалася як "не выбарнае", уяўляла з сябе "дыктатарскі орган партыйнай меншасці" [7, арк. 73 – 74]. У той жа час (7 верасня) быў накіраваны зварот да Парыжскай мірнай канферэнцыі, у якім выказваўся папрок у адрас РСФСР у невыкананні на практыцы прынцыпу самавызначэння нацый, якая "не мае права выступаць у якасці гаспадара беларускіх зямель" [7, арк. 105]. Копія адзначанай ноты была накіравана на адрас кіраўніка расійска-ўкраінскай дэлегацыі адразу пасля яго прыезду ў Рыгу. Як контрмера на ноту БНР ад 7 верасня 1920 г., 10 верасня Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) БССР перадае РСФСР "самы шырокі мандат на вядзення мірных перагавораў з Польшчай, галоўным чынам, па вызначэнні меж Беларусі" [8, арк. 3]. Удзелу дэлегацыі ад БССР у якасці самастойнай адзінкі не прадугледжвалася. Так, Г. В. Чычэрын 12 верасня 1920 г. паведамляў А. А. Іофэ: "У Мінску адчыняецца з'езд Саветаў і магчыма будзе паднята пытанне аб адпраўцы сваіх дэлегатаў у Рыгу. Я тэлеграваў, што спачатку беларускі савецкі ўрад павінен аформіцца і толькі тады можна будзе распрацоўваць пытанне аб яго міжнародных зносінах" [10, с. 43].

Але праз некалькі дзён, 14 верасня 1920 г., А. А. Іофэ ў лісце да Г. В. Чычэрына запытаў пазіцыю савецкага кіраўніцтва адносна прадстаўніцтва Беларусі на мірнай канферэнцыі. У выніку было вырашана накіраваць у Рыгу А. Р. Чарвякова разам з сакратаром І. Г. Клішэўскім. Па яго сцвярджэннях, прысутнасць прадстаўніка БССР на мірнай канферэнцыі ў Рызе была выклікана "актыўнымі дзеяннямі дзеячоў Найвышэйшай Рады БНР, якія распачалі перагаворы з польскім бокам адносна іх удзелу на канферэнцыі" [9, арк. 178]. 19 верасня 1920 г. А. А.Іофэ ў тэлеграме да Г. В. Чычэрына зазначаў,

што “не трэба весці ніякіх спраў ні з Ластоўскім, ні з яго агентамі, бо яны падкуплены палякамі” [2]. Немалаважнае значэнне меў факт прасоўвання польскіх войскаў углыб беларускіх зямель: 21 жніўня 1920 г. быў заняты Брэст-Літоўск, у пачатку кастрычніка 1920 г. лінія фронту на Беларусі праходзіла на ўсход ад Ліды, Баранавіч, Пінска; 3 кастрычніка 1920 г. кіраўніцтва Заходняга фронту загадала савецкім войскам адысці на лінію воз. Нарач – Смаргонь – Старобін – Маладзечна – Краснае – Заслаўе – Самахвалавічы – Старобін – р. Случ. На думку Польскага Бюро пры ЦК РКП (б), будучыя польскія ўмовы перамір’я будуць патрабаваць “стварыць новыя незалежныя дзяржавы на тэрыторыі Украіны, Беларусі і Літвы. Беларусь сама павінна заявіць, ці жадае яна далучыць сваю краіну альбо яе частку да Літвы, Польшчы, ці Расіі, або стварыць незалежны дзяржаўны арганізм” [11, s. 46]. Дакладнай інфармацыі пра стратэгічныя планы Польшчы на плануемых мірных перагаворах у савецкага кіраўніцтва не было. Да гэтага дадаваліся чуткі пра намеры Ю. Пілсудскага пасля захопу Мінска ўсталяваць “беларускі ўрад”, выбраны з прадстаўнікоў Найвышэйшай Рады БНР, які б знаходзіўся ў федэратыўнай сувязі з Польшчай. Прымаліся меры і па аб’яднанні вакол агульнага цэнтра прадстаўнікоў Найвышэйшай і Народнай Рады: у ліпені – жніўні 1920 г. адбылася сустрэча В. Ластоўскага з Л. Васілеўскім для рэалізацыі гэтай задачы, аднак яна скончылася безвынікова. Нестабільнасць палітычнай сітуацыі вымушала кіраўніцтва Савецкай Расіі ўлічваць кан’юнктурныя змены.

На пасяджэнні ВРК БССР 16 верасня 1920 г. А. Р. Чарвякову быў выдадзены мандат на вядзенне перагавораў у Рызе, які аб’яўляў яго “адзіным беларускім прадстаўніком. З паўнамоцтвамі заключаць з польскай мірнай дэлегацыяй любыя дагаворы, якія датычыліся перамір’я, міру, абмену ваеннапалоннымі, усталявання меж і гандлёвых зносін паміж БССР і Польшчай” [3]. На жаль, у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь тэкст адзначанага мандата апушчаны, у пратаколе пасяджэння ВРК БССР занатаваны толькі выраз “дэлегіраваць А. Р. Чарвякова і даць яму паўнамоцтвы”, без далейшай канкрэтызацыі. Тэкст у поўным аб’ёме прыводзіцца ў справаздачы А. А. Іофэ ў НКЗС РСФСР ад 23 верасня 1920 г., якая захоўваецца ў Архіве знешняй палітыкі РФ. Магчыма па гэтай прычыне згадак пра існаванне дадзенага мандата ВРК БССР у айчыннай гістарыяграфіі не сустракаецца.

Практычнае выкарыстанне адзначанага мандата ставілася ў прамую залежнасць ад агульнага ваенна-аператыўнага становішча. “Са зменамі на фронце можа змяніцца і сітуацыя ў беларускім пытанні, яно стане ў поўным аб’ёме”, – зазначаў А.Р. Чарвякоў у лісце да ЦБ КП(б)Б ад 4 кастрычніка 1920 г. [5, с. 200]. У размове па прамым провадзе Г. В. Чычэрын раіў А. А. Іофэ не выкарыстоўваць мандат ад 16 верасня да больш зручнага моманту, а прадставіць польскай дэлегацыі “паперу, якая ўпаўнаважвае нас вызначаць граніцу Беларусі” [10, с. 58].

А. Р. Чарвякоў і І. Г. Клішэўскі выехалі 18 верасня ў Рыгу, дзе 21 верасня адбылося ўрачыстае адкрыццё мірнай канферэнцыі. Фактычна ВРК БССР выдаў два мандаты на вядзенне перагавораў, што давала магчымасць разглядаць беларускае пытанне з розных бакоў, усе залежала непасрэдна ад пазіцыі польскай дэлегацыі. Аднак яна выступіла супраць падключэння прадстаўнікоў Савецкай Беларусі да мірных перагавораў, не прызнала легітымнасці беларускай савецкай дзяржаўнасці, разам з ёй і мандат ВРК БССР ад 16 верасня 1920 г. Польскі бок згадзіўся на патрабаванні РСФСР на самастойны ўдзел УССР у перагаворах, але выступіў рашуча супраць такога ж удзелу БССР, адмаўляючы ёй у статусе незалежнай і суверэннай дзяржавы. Спасылаючыся на тое, што Беларусь не мае дакладна вызначанай усходняй мяжы, паўнацэнных прадстаўнічых органаў, сфарміраваных на аснове свабодных выбараў, і прадстаўніцтва на міжнароднай арэне.

Зыходзячы з агульнай пазіцыі польскай дэлегацыі, яшчэ 23 верасня 1920 г. А. А. Іофэ звярнуўся да Г. В. Чычэрына з просьбай даць інструкцыю адносна мэтазгоднасці знаходжання ў Рызе беларускай і галіцыйскай дэлегацый. Ён лічыў, што кіраўнікі БССР павінны застацца на канферэнцыі ў якасці кансультантаў ці экспертаў да больш спрыяльнага моманту, калі яны змогуць выступіць у якасці афіцыйных асоб. У сваю чаргу, Г.В. Чычэрын параіў А. А. Іофэ рабіць акцэнт на мандат, выданы беларусамі дэлегацыі РСФСР, і ў далейшым тэму прысутнасці беларусаў у Рызе не закранаць. Але А. Р. Чарвякоў працягваў заставацца ў Рызе, “інкогніта”, працягваючы “чакаць агульнай змены становішча на фронце, прымаючы ўдзел у пасяджэннях канферэнцыі, аднак не выконваючы ніякай ролі “ні паўнамоцнага прадстаўніка, ні кансультанта” [5, с. 201]. 28 верасня 1920 г. А. Р. Чарвякоў паведаміў з Рыгі, што ён не мае магчымасці зрабіць што-небудзь адносна ўжо вырашанага падзелу Беларусі і застаецца ў

латвійскай сталіцы толькі з-за партыйнай дысцыпліны. А. Р. Чарвякоў спрабаваў паўплываць на ход перагавораў шляхам ціску на А. А. Іофэ. Аднак кіраўнік расійскай дэлегацыі запэўніў кіраўніка БССР, што пытанне пра ўдзел беларусаў у працы канферэнцыі можна будзе паставіць пасля ліквідацыі войскаў П. М. Урангеля, калі савецкая ўлада ўзмацніцца.

У якасці процідзеяння прадстаўнікам БССР выступала дэлегацыя, складзеная Радай Народных Міністраў БНР 28 верасня 1920 г., на чале з В. Ластоўскім, яе членамі з'яўляліся А. Цвікевіч, А. Аўсянік, А. Галавінскі, У. Пігулеўскі, П. Крычэўскі. Рашэннем Рады Міністраў БНР 1 кастрычніка 1920 г. была прынята тактыка дзеянняў шляхам накіравання дэкларацыі на адрас польска-расійска-ўкраінскай канферэнцыі ў Рызе з патрабаваннем прызнаць незалежнасць БНР і дапусціць дэлегацыю да ўдзелу ў перагаворах. Адзначаная дэкларацыя была падрыхтавана яшчэ 2 кастрычніка 1920 г., але яе накіраванне на адрас польскай і расійска-ўкраінскай мірных дэлегацый адбылося толькі 5 кастрычніка. Пра адтэрміноўку накіравання дэкларацыі БНР настойліва прасіў Л. Васілеўскі падчас прыватнай сустрэчы з В. Ластоўскім [1, с. 881–882]. Дэкларацыя аспрэчвала правы Польшчы і Савецкай Расіі вызначаць будучыню беларускіх зямель, прыводзячы як аргумент факт абвяшчэння самастойнай беларускай рэспублікі ў сакавіку 1918 г. Своеасаблівую характарыстыку дзеянням дэлегацыі Рады Народных Міністраў БНР даў В. Ластоўскі ў 1930 г. ва ўласнаручных паказаннях у НКУС БССР: "Справа прасоўвалася вельмі марудна, складвалася ўражанне, што нікому не было ніякай справы да працы канферэнцыі" [6, с. 211].

Прадстаўнік Міністэрства замежных спраў БНР Я. Чарапук атрымаў дазвол ад польскай дэлегацыі прымаць удзел у пленарным пасяджэнні мірнай канферэнцыі, праўда ў якасці прыватнай асобы. Наступным крокам дзеячаў БНР сталі захады па арганізацыі сустрэчы з Л. Васілеўскім, В. Камянецкім для правядзення перагавораў. Адзначаныя сустрэчы адбыліся з 1 па 6 кастрычніка 1920 г. Дэлегацыя БНР па-ранейшаму адстойвала ідэю незалежнасці і непадзельнасці беларускіх зямель, у этнаграфічных межах. Польскія прадстаўнікі, заслухаўшы беларускі бок, настойліва раілі "аб'яднаць усе беларускія сілы каля аднаго цэнтра, толькі ў гэтым выпадку беларускае пытанне можа быць вырашана станоўча". Планавалася стварэнне беларускага

ўрада ў Мінску, які знаходзіўся б у саюзных адносінах з польскай дзяржавай, стварэнне беларускіх вайсковых фарміраванняў [1, с. 901]. Супрацоўніцтва абодвух лагераў палітычных сіл БНР (Народнай і Найвышэйшай Рад) адбылося шляхам перадачы К. Цярэшчанкам мандата на ўдзел у мірных перагаворах у Рызе дэлегацыі на чале з В. Ластоўскім.

У сітуацыі, калі падзел тэрыторыі Беларусі быў ужо прадвызначаным фактам, дзве беларускія дэлегацыі распачалі перагаворы. У канцы кастрычніка 1920 г., ужо пасля падпісання прэлімінарнага мірнага дагавора, А. Галавінскі і А. Аўсянік звярнуліся да А.Р. Чарвякова з прапановай “аб’яднаць намаганні па адстойванні інтарэсаў беларускіх зямель на мірнай канферэнцыі” і “абмеркаваць магчымасць далейшага супрацоўніцтва паміж рознымі беларускімі групамі” [4]. Таксама падчас гэтай сустрэчы прадстаўнікі БНР выказалі намер пачаць прамыя перагаворы непасрэдна з РСФСР, прасілі пасрэдніцтва ў кіраўніка Савецкай Беларусі, выказалі жаданне разгарнуць шырокую працу на тэрыторыі рэспублікі. Аднак гэтыя прапановы былі адхілены праз сакратара расійска-ўкраінскай дэлегацыі І. Л. Лорэнца, змест сустрэчы быў паведамлены ў Народны камісарыят замежных спраў РСФСР, які раіў адхіліць прапановы прадстаўнікоў БНР, якіх ён кваліфікаваў як “людзей, падкупленых польскімі ўладамі” [4]. Падчас тэлефоннай размовы В.Г. Кнорына з Г. В. Чычэрыным у лістападзе 1920 г. факт супрацоўніцтва кіраўніцтва ВРК БССР з урадам В.Ю. Ластоўскага з намерам стварыць кааліцыйны ўрад быў расцэнены як небяспечны для існавання дыктатуры пралетарыяту.

Шанец беларускіх прадстаўнікоў пэўным чынам паўплываць на агульны змест польска-савецкіх перагавораў, нават шляхам аб’яднання дзеянняў, быў упушчаны. Прысутнасць прадстаўнікоў ад БССР, якая разглядалася ў пачатку лістапада 1920 г., кіраўніцтва Савецкай Расіі ўжо падчас другога этапу рыжскіх польска-савецкіх перагавораў палічыла немэтазгодным. Фактычна рашэнне адносна беларускага пытання было прынята, яно амаль не змянілася да сакавіка 1921 г. 12 снежня 1920 г. Г. В. Чычэрын у лісце да А. А. Іофэ звяртаў увагу на неаформленасць урада БССР. Кіраўнік расійска-ўкраінскай дэлегацыі таксама не выказваў энтузіязму адносна ўдзелу беларускага прадстаўніка ў мірнай канферэнцыі. А. А. Іофэ разглядаў верагоднасць беларускага прадстаўніцтва толькі ў выпадку павелічэння тэрыторыі

беларускай рэспублікі за кошт Віцебскай і Гомельскай губерняў, далучаных да РСФСР у студзені 1919 г.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: у 2 кн.: Кн. 1.: 1917–1925 гг. Вільня–Нью-Ёрк–Менск–Прага, 1998. Ч. 1: 1917–1920.

2. Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (АЗП РФ). Ф. 04. Воп. 32. Спр. 40. Л. 34.

3. АЗП РФ. Ф. 04. Воп. 32. Спр. 40. Л. 43.

4. АЗП РФ. Ф. 04. Воп. 32. Спр. 41. Л. 78–80.

5. Знешняя палітыка Беларусі: зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 1: 1917–1922 гг. Мінск: БелНДІДАС, 1997.

6. Міхнюк, У. М. Справа Вацлава Ластоўскага // Маладосць. 1993. № 8. С. 203–242.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 325. Воп. 1. Спр. 98.

8. НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 1.

9. НАРБ. Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 452.

10. Польско-советская война 1919–1920 (ранее не опубликованные документы и материалы). М.: ИСБ РАН, 1994. Ч. 2.

11. Pruszyński, M. Rozmowa historyczna ze St. Grabskim // Zeszyty historyczne. Paryż: Instytut Literacki, 1976. № 36. S. 41–59.